Я хачу жанчыну прэзыдэнтку. Прэзідэнтку хатнюю гаспадыню, прыбіральшчыцу, настаўніцу, медсястру, павітуху. Беспрацоўную, пенсіянерку, без дзяцей, шматдзетную, маці адзіночку. Жанчыну, якая кахае іншую. Прэзідэнтку ў спадніцы, у штанах, у спартыўным касцюме. Якая не кажа пра нацыю, якая нелегалка, акая нябелая, у якой родныя і сябры не гавораць пра нацыю.

Я хачу прэзыдэнтку, якая не хавае што п‘е, ужывае наркотыкі, пакутуе дэпрэсіямі, не хавае, што баіцца застацца адна. Я хачу прэзыдэнтку, якую ташніць ад гвалту, якая разумее, што пакаранне не працуе. Прэзідэнтку, якая вымушана была красці і гандляваць сваім целам, ночыла на вуліцы, якая ня пойдзе служыць у войска, ня стане міліцыянеркай, высмее стукацтва, звольніць КДБ. Прэзідэнтку мастачку, актрысу, музыку, безграшовую паэтку.

Прэзідэнтку, якая слухае, а не гаворыць. Прэзідэнтку, якая не размаўляе па-беларуску, якая не размаўляе па-русску. Якая нямая, якая ведае, што мова гэта ўлада, што мова можа несці гвалт, прэзідэнтку, якая не абражае народ. Я хачу прэзыдэнтку, якую ня трэба ахоўваць, якой не патрэбны АМАП, але патрэбны медыкаменты у бальніцах, якая не будуе сябе палацаў, атамных станцый, не задавальняе парадаў, якая ведае, што палітыка гэта мы ўсе, што вайна і рэпрэсіі гэта канец палітыкі. Прэзідэнтку, якая з нараджэння сляпая. Прэзідэнтку, якая адчувае сваіх безназоўных бабуль, якая ведае, што такое фашызм. Прэзідэнтку, якая ведае, што мінулае заўсёды з намі, а будучыня ўжо зараз. Якая ведае, што такое гвалт, якая цярпела і якая не будзе больш цярпець. Якая не хавае залежнасць, слабасці, хваробы, узросту.

Прэзідэнтку не эканамістку, таму што дзяржава, гэта не бізнэс, а клопат аб слабых, аб нябачных, аб выключаных, дзяржава, гэта не ўзбагачэнне і ўлада, а клопат.